## Незабыўнае

*Царук Дарья*, студентка группы 11102117, АФ.
Кіраўнік ст. выкладчык *А.М. Дайняк*.

У гісторыі нашай краіны падзеі Вялікай Айчыннай вайны былі і застаюцца вельмі значнай старонкай.

Па ўсёй тэрыторыі чуўся подых вайны. Напачатку людзі не разумелі, што адбываецца. Гэта было нечакана, але ўсё ж было. Вайна прынесла шмат болю, крыві. Шмат людзей загінула, змагаючыся за сваю Радзіму, за мірнае неба над галавой. Сваімі вачамі бачылі вайну мае прадзед і прабабка. З тых часоў прайшлі дзесяцігоддзі. Ужо нават бабулі і дзядулі нарадзіліся пасля вайны, а калі нарадзілася я, прадзеда Мікалая, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ужо не было сярод жывых. Бачыла толькі яго фотаздымак у альбоме. На здымку – малады салдат у гімнасцёрцы і пілотцы. На грудзях – баявыя ўзнагароды і нашыўкі за раненні.

Аднойчы тата знайшоў у інтэрнэце загад аб узнагароджанні яго дзеда, а майго прадзеда. У наградным лісце апісвалася баявая аперацыя, за якую радавога Мікалая Собаля прадставілі да ўзнагароджання медалём “За адвагу”. Узнікла жаданне даведацца пра яго як мага больш.

Бабуля падрабязнасцей ведала няшмат. Сказала, што яе бацька не любіў узгадваць аб вайне. І тым не менш…

Незадоўга да вайны яе будучы бацька закончыў Дзяржаўны ўніверсітэт у Мінску і быў прызваны на вайсковую службу ў Чырвоную Армію. Ён служыў у артылерыі.

22 чэрвеня 1941 года, у дзень, калі пачалася вайна, корпус прыняў першы бой. Немцы былі значна мацней. Вялікія ахвяры і пакуты чакалі людзей.

Падчас жорсткіх баёў пад Псковам мой прадзед быў паранены. Калона машын, што везла раненых у Ленінград, была знішчана нямецкім дэсантам. Прадзед нейкім цудам выратаваўся, трапіў у шпіталь. Пасля выздараўлення яго накіравалі ў адзін з палкоў Ленінградскага апалчэння. Трэба адзначыць, што апалчэнне складвалася не толькі з цывільных. Туды накіроўвалі і вайскоўцаў, якія выпісваліся са шпіталяў.

Артылерыйскі полк, у якім ён служыў, абараняў акружаны Ленінград, а потым быў накіраваны ў Запаляр'е, суровы скалісты край. Дарэчы, сярод узнагарод маладога артылерыста была медаль "За абарону Савецкага Запаляр'я". Вайну салдат – артылерыст закончыў у Нарвегіі.

У хуткім часе ў складзе зводнага палка Карэльскага фронту Мікалай прыбыў у Маскву. У палку было звыш тысячы чалавек, якія вызначыліся ў баях.

24 чэрвеня 1945 года адбыўся парад Перамогі. У новай парадней форме зводны полк Карэльскага фронту першым пасля спецыяльнай калоны прайшоў па бруку Чырвонай плошчы.

Праз год прадзеда дэмабілізавалі і ён вярнуўся ў паўразбураны Мінск. Пачыналася мірнае жыццё. Аб вайне нагадвалі руіны сталіцы ды ныючыя час ад часу раны.

Бабуля расказала, што з 1960-х гадоў ветэраны Ленінградскага апалчэння пачалі штогод на 9 мая прызначаць сустрэчы. Стары салдат з хваляваннем чакаў іх, каб пабачыць баявых сяброў, прайсці па Неўскаму праспекту, набярэжнай і плошчах горада, з якім звязалі яго падзеі вайны.

Цяпер, углядваючыся ў твар салдата на фотаздымку, я разумею, чаму ён такі светлы і натхнёны. Наперадзе было мірнае жыццё, жыццё, за якое ён змагаўся і перамог разам з усім народам, за якое самаахвярна бараніў Бацькаўшчыну.

Падводзячы вынікі, з упэўненасцю магу сказаць, што Вялікая Айчынная вайна не пусты гук для людзей, якія жывуць пасля яе. Вечная памяць, спачуванне да загінуўшых у баю, падзяка нашым продкам, смутак і ў той жа час вялікі гонар – усё гэта адчуваюць людзі, калі ўспамінаюць тыя жудасныя падзеі. Шмат перанесла на сваіх плячах тое пакаленне. Мы ніколі не забудзем пра іх ахвяры і пра тое, які неацэнны дарунак – шчасце жыць пад мірным небам – яны пакінулі нам, рызыкуючы сваім жыццём.

Я часта лавіла сябе на думцы, што выпрабаванні, якія выпалі на долю маіх блізкіх, як і на долю грамадзян нашай дзяржавы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, гэта надзвычай жорсткія выпрабаванні. Нам, сённяшняй моладзі, складана ўявіць тыя жахі вайны, бо мінула шмат часу, але я магу сказаць адно: "У нашых сэрцах заўсёды будзе жыць памяць пра вайну".